**Пашковіч, А.** Жыццёвая пазіцыя / А. Пашковіч // Патрыёт (Ушачы). — 2003. — 15 лют. — С. 2.

**ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ**



Крывавыя рэаліі ваеннага жыцця Васіль Бяльковіч убачыў увачавідкі яшчэ ў даволі маладым узросце. Менавіта Афганістан стаў для яго месцам праходжання тэрміновай службы. Як прыгавор тады гучала накіраванне ў гэтую «гарачую кропку», многія змаглі адкупіцца. А хтосьці ад пачатку да канца з годнасцю выконваў свой інтэрнацыянальны абавязак.

Як і многія ветэраны-афганцы, Васіль Фаміч не любіць успамінаць пра тую вайну. Балюча... Горка... Крыўдна, нарэшце. Разумею.

Аднак тое, што «афган» стаў сур’ёзнай школай жыцця – бясспрэчна. Менавіта там ён па-сапраўднаму навучыўся цаніць жыццё, радавацца кожнаму наступіўшаму дню.

Некалькі армейскіх гадоў на ўсё жыццё пакінулі ў яго сэрцы балючы след, і толькі ў патаемных успамінах Васіль Фаміч бачыць твары сяброў, чые жыцці абарваліся на чужыне...

А тым часам, за сотні кіламетраў ад афганскай вайны, на яго малой радзіме, пад Докшыцамі, размерана цякло мірнае жыццё. У мілай сэрцу вёсачцы з паэтычнай назвай Бярозкі жылі яго бацькі, сельскія настаўнікі. Менавіта там і засталося шмат распачатых Васілём спраў. У адной з шуфлядак стала яго чакалі падручнікі, канспекты, студэнцкі білет лесагаспадарчага факультэта БТІ імя Кірава.

Ледзь паспеўшы скончыць першы курс завочнага аддзялення, яго прызвалі ў армію. Пасля службы працягваў вучобу, толькі ўжо на дзённай форме навучання.

Пасля заканчэння інстытута была вялікая спакуса стаць жыхаром сталіцы, і прапановы нядрэнныя былі яму, як сакратару камсамольскай арганізацыі ВНУ. Толькі, відаць, не па душы быў Васілю Бяльковічу вялікі горад. Хацелася нейкага прыемнага спакою. Вось і апынуўся на Ушаччыне.

У лясгасе прапанавалі маладому спецыялісту пасаду памочніка ляснічага Глыбачанскага лясніцтва. А літаральна праз паўгода ён ужо ўзначаліў калектыў. Там жа, на месцы, пабудаваў хату, абаснаваўся сям’ёй, дзе падрасталі дзве дачушкі.

Шэсць гадоў самаадданай плённай працы і – калектыў Глыбачанскага лясніцтва стаў адным з лепшых у лясгасе. Менавіта заўважыўшы гэтую кіраўніцкую здольнасць, ацаніўшы адданасць справе, В. Ф. Бяльковіча пераводзяць ва Ушачы галоўным ляснічым лясгаса.

Жыццёвая пазіцыя лесавода не проста вызначана нейкімі вехамі яго біяграфіі, яна выпакутавана душой менавіта тых смяротных эпізодаў афганскай вайны, калі ніхто з салдат не ведаў, ці наступіць для яго заўтра.

Цяпер Васіль Фаміч упэўнены: жыць неабходна сённяшнім днём і ствараць для сябе і ўсіх хто побач, такія ўмовы, каб на душы было радасна і спакойна, каб ва ўсім адчувалася задавальненне.

**А. Пашковіч**

На здымку: Васіль Бяльковіч